**СУПРАЦОЎНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З КРАІНАМІ СНД У ГАЛІНЕ АХОВЫ ПРАМЫСЛОВАЙ УЛАСНАСЦІ (1991–2012 гг.)**

Я.С. Мальчэўскі (Мінск)

Ва ўмовах развіцця інтэграцыйных працэсаў з улікам неабходнасці пабудовы інавацыйнай эканомікі, эканомікі заснаванай на ведах, у якой прыярытэтнае месца займаюць ужо не традыцыйныя фактары вытворчасці і прыродныя рэсурсы, а інфармацыя і тэхналогіі, асаблівае значэнне набывае міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне аховы прамысловай уласнасці.

З моманту ўтварэння Рэспублікі Беларусь адным з прыярытэтных напрамкаў міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны стала аднаўленне эканамічных і навукова-тэхнічных сувязей з краінамі былога СССР і фарміраванне адпаведнай прававой базы ў гэтай сферы.

12 сакавіка 1993 г. у Маскве кіраўнікі ўрадаў дзевяці дзяржаў СНД (Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана, Узбекістана і Украіны) падпісалі Пагадненне аб мерах па ахове прамысловай уласнасці і стварэнні Міждзяржаўнага савета па пытаннях аховы прамысловай уласнасці [1. с. 23]. Гэтым Пагадненнем быў заснаваны адмысловы калегіяльны орган – Міждзяржаўны савет па пытаннях аховы прамысловай уласнасці. Асноўныя задачы Савета ўключалі каардынацыю сумеснай дзейнасці па стварэнні міждзяржаўнай сістэмы аховы аб'ектаў прамысловай уласнасці, гарманізацыю нацыянальнага заканадаўства ў галіне прававой аховы гэтых аб'ектаў і распрацоўку Канвенцыі па ахове прамысловай уласнасці [8]. У 1990-х гг. Саветам была праведзена значная работа па далейшаму развіццю супрацоўніцтва паміж краінамі СНД. Дадзены орган стаў выконваць функцыю своеасаблівай платформы па рэалізацыі прасунутых інтэграцыйных праектаў у галіне аховы прамысловай уласнасці.

Ужо ў верасні 1993 г. на пасяджэнні Міждзяржаўнага савета па пытаннях аховы прамысловай уласнасці ў Ужгарадзе быў прыняты праект Еўразійскай патэнтавай канвенцыі. Праз год, 9 верасня 1994 г., яе падпісалі кіраўнікі ўрадаў Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана і Украіны [3].

Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Еўразійскую патэнтавую канвенцыю ў маі 1995 г. і ўжо ў жніўні гэтага года канвенцыя ўступіла ў сілу.

Еўразійская патэнтавая канвенцыя, прадугледжвала стварэнне адзінай Еўразійскай патэнтавай сістэмы, асноўным прызначэннем якой было прадастаўленне магчымасці фізічным і юрыдычным асобам абараніць права на свае вынаходствы на аснове адзінага еўразійскага патэнта адначасова на тэрыторыі ўсіх дзяржаў-удзельніц Еўразійскай патэнтавай канвенцыі. Для выканання задач, звязаных з функцыянаваннем Еўразійскай патэнтавай сістэмы і выдачы еўразійскіх патэнтаў, Канвенцыяй была заснавана Еўразійская патэнтавая



Репозиторий ВГУ

арганізацыя і яе органы: Адміністрацыйны савет (прадстаўнічы орган) і Еўразійскае патэнтавае ведамства (выканаўчы орган) [2].

Акрамя шматбаковых інтэграцыйных праектаў, у пачатку 1990-х гг. пачало актыўна развівацца двухбаковае супрацоўніцтва нашай краіны з краінамі СНД ў галіне аховы прамысловай уласнасці. У 1993 – 1994 гг. былі падпісаны міжурадавыя пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне аховы прамысловай уласнасці з Украінай і Расіяй [4]. Гэтыя пагадненні прадугледжвалі спрашчэнне працэдур падачы і разгляду заявак на аб'екты прамысловай уласнасці для рэзідэнтаў названых краін, забеспячэнне для іх роўнага доступу да патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў, узаемны абмен нарматыўнымі прававымі актамі ў сферы прамысловай уласнасці [1. с. 22]. Пазней у 2004 – 2006 гг. падобныя міжурадавыя пагадненні былі заключаны з Малдовай, Азербайджанам і Кыргызстанам [4].

У 1993 – 1995 гг. міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы прамысловай уласнасці развівалася таксама і на міжведамасным узроўні, што знайшло адлюстраванне ў падпісанні Дзяржаўным патэнтавым ведамствам Рэспублікі Беларусь пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне аховы прамысловай уласнасці з патэнтнымі ведамствамі Арменіі і Узбекістана [1. с. 22], якія прадугледжвалі абмен нарматыўнымі прававымі актамі ў адпаведнай сферы і стажыроўкі спецыялістаў патэнтавых ведамстваў за мяжой.

Канец 1990-х – пачатак 2000-х гг. характарызуецца заключэннем у рамках СНД на платформе Міждзяржаўнага савета па пытаннях аховы прамысловай уласнасці шэрагу міжнародных дагавораў, якія рэгулююць ахову і абарону правоў на асобныя аб'екты прамысловай уласнасці (вынаходніцтвы, гатункі раслін, таварныя знакі і знакі абслугоўвання) [4]: Пагадненне аб узаемным забеспячэнні захаванасці міждзяржаўных сакрэтаў у галіне прававой аховы вынаходстваў ад 4 чэрвеня 1999 г.; Пагадненне аб мерах па папярэджанні і спыненні выкарыстання ілжывых таварных знакаў і геаграфічных указанняў ад 4 чэрвеня 1999 г.; Пагадненне аб прававой ахове сартоў раслін ад 16 Сакавіка 2001 г.

Новы імпульс развіцце міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне прамысловай уласнасці ў краінах СНД атрымала ў канцы першага дзесяцігоддзя XXI стагоддзя.

19 лістапада 2010 г. падпісваецца Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне прававой аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці і стварэнні Міждзяржаўнага савета па пытаннях прававой аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці [9]. Міждзяржаўны савет па пытаннях прававой аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці, утвораны дадзеным Пагадненнем, быў заклікаными замяніць сабою Міждзяржаўны савет па пытаннях аховы прамысловай уласнасці. І ўжо ў верасні 2011 г. у Мінску прайшло апошняе паседжанне Міждзяржаўнага савета па пытаннях аховы прамысловай уласнасці і Сумеснай працоўнай камісіі дзяржаў-удзельнікаў Дамовы аб супрацоўніцтве па спыненні правапарушэнняў у вобласці інтэлектуальнай уласнасці, якое стала адначасова арганізацыйным паседжаннем Міждзяржаўнага савета па пытаннях прававой аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці [5].

У значнай ступені ўзмацненне інтэграцыйных працэсаў ў галіне аховы прамысловай уласнасці на постсавецкай прасторы было звязана з фарміраваннем Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. У снежні 2010 г. у рамках стварэння Адзінай эканамічнай прасторы Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі (далей – АЭП) было заключана Пагадненне аб адзіных прынцыпах рэгулявання ў сферы аховы і абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці (далей – Пагадненне), якое ўступіла ў сілу 1 студзеня 2012 г. [7].

Палажэнні Пагаднення накіраваны на забеспячэнне свабоднага перамяшчэння тавараў і паслуг на рынку АЭП з улікам гандлёвых аспектаў



Рэпозиторий ВГУ

інтэлектуальнай уласнасці. Пагадненне не замяняе сабой нацыянальнае заканадаўства краін, якія ўваходзяць у АЭП, а ўстанаўлівае асноўныя прынцыпы і мінімальныя стандарты прававой аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці, якія павінны быць выкананы ўсімі трыма Бакамі. У рамках АЭП такія стандарты з'яўляюцца важнымі для ўсіх удзельнікаў знешнегандлёвых здзелак, паколькі робяць больш прадказальнымі прававыя наступствы перамяшчэння тавараў, якія змяшчаюць аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Акрамя таго, імкнучыся ўступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю, Беларусь, Расійская Федэрацыя і Казахстан заяўляюць у Пагадненні аб тым, што яны падзяляюць прынцыпы Пагаднення па гандлёвых аспектах правоў інтэлектуальнай уласнасці гэтай арганізацыі, якое ўяўляе сабой той мінімум абароны інтэлектуальнай уласнасці, які павінен быць выкананы ва ўсіх краінах Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

Пагадненнем ўводзіцца новы для нацыянальных заканадаўстваў краін АЭП прынцып рэгіянальнага вычарпання правоў на таварны знак. Так, з 1 студзеня 2012 г. не з'яўляецца парушэннем выключнага права на таварны знак выкарыстанне гэтага таварнага знака ў адносінах да тавараў, якія былі правамерна ўведзены ў грамадзянскі абарот на тэрыторыі дзяржаў - удзельніц Пагаднення непасрэдна праваўладальнікам або іншымі асобамі з яго згоды. Гэта азначае, што Бакі Пагаднення прызнаюць больш важным свабоднае перамяшчэнне тавараў у рамках АЭП і развіццё канкурэнцыі, чым захаванне за праваўладальнікам магчымасці змагацца з паралельным імпартам у межах трох краін.

Для каардынацыі дзеянняў і інфармацыйна-тэхнічнага супрацоўніцтва ў галіне аховы і абароны інтэлектуальнай уласнасці паміж ведамствамі удзельніц Пагаднення на рэгулярнай аснове прадугледжана стварэнне пастаянна дзеючага інстытуцыйнага механізму – Каардынацыйнага савета АЭП па інтэлектуальнай уласнасці. У цяперашні час для рэалізацыі палажэнняў Пагаднення вядзецца распрацоўка праектаў некалькіх міжнародных дагавораў [6. с. 4], сярод якіх варта адзначыць Дагавор аб адзіных механізмах (працэдурах) рэгістрацыі таварных знакаў і найменняў месцаў паходжання тавару (геаграфічных указанняў) (далей – Дагавор) і Пагадненне аб каардынацыі дзеянняў ўпаўнаважаных органаў па абароне правоў на выніки інтэлектуальнай дзейнасці.

Праект Дагавора накіраваны на ўвядзенне адзіных працэдур, якія забяспечваюць атрыманне прававой аховы таварных знакаў і найменняў месцаў паходжання тавараў (геаграфічных указанняў) на тэрыторыі ўсіх краін АЭП. Ен змяшчае палажэнні, якія вызначаюць парадак падачы і экспертызы заявак на таварныя знакі і назвы месцаў паходжання тавараў у краінах АЭП; вядзення Адзінага рэестра гэтых аб'ектаў прамысловай уласнасці і выдачы ахоўных дакументаў на іх, якія дзейнічаюць адначасова на тэрыторыі ўсіх краін АЭП. Праектам Пагаднення аб каардынацыі прадугледжваюцца асноўныя напрамкі і парадак узаемадзеяння упаўнаважаных органаў дзяржаў АЭП па абароне правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці.

Ад пачатку 1990-х гг. развіццё сувязей у рамках СНД стала прыярытэтам міжнароднай палітыкі Беларусі у сферы аховы прамысловай уласнасці. Наша краіна актыўна ўдзельнічала ў заключэнні адпаведных міжнародных дагавораў. Супрацоўніцтва развівалась як на платформе СНД, так на двухбаковай, а з канца 2010 г. і на трохбаковай асновах, што выявілася ў фарміраванні прававога падмурка адзінага рынка інтэлектуальнай уласнасці АЭП.

1. Глеб, А.К. В русле глобального интеграционного процесса / А.К. Глеб // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 1999. – № 4. – С. 17 – 25.



Репозиторий ВГУ

2. Евразийская патентная конвенция от 9 сентября 1994 года // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр прававой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2013.
3. История создания Евразийской патентной системы // Евразийская патентная организация [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://www.eapo.org/ru/history.html. – Дата доступа: 15.03.2013.
4. Международные договоры / Законодательство / Система управления ИС // Национальный центр интеллектуальной собственности [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://belgospatent/index.php?option=com_content&view=article&id=131&Itemid=54#2. – Дата доступа: 15.03.2013.
5. Национальный центр интеллектуальной собственности: Годовой отчет 2011 [Электронный ресурс]. –2013. – Режим доступа: http://belgospatent.org.by/files/Report_2011.pdf. – Дата доступа: 15.03. 2013.
6. Совершенствование законодательства // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2012. – № 3. – С. 3 – 5.
7. Соглашение о единых принципах регулирования в сфере охраны и защиты прав интеллектуальной собственности от 9 декабря 2010 года // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр прававой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2013.
8. Соглашение о мерах по охране промышленной собственности и создании Межгосударственного совета по вопросам охраны промышленной собственности от 12 марта 1993 г. // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр прававой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2013.
9. Соглашение о сотрудничестве в области правовой охраны и защиты интеллектуальной собственности и создании Межгосударственного совета по вопросам правовой охраны и защиты интеллектуальной собственности от 19 ноября 2010 года // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр прававой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2013.


Репозиторий ВГУ